Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 197 (28813)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ ЭКСКУРСАВОДА – ФАНТАЗІЯ? 5

АДКРЫЦЦІ ФОРУМУ РЭГІЁНАЎ МС

ГРЫБНЫ ПАРОМ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Суседзі — жыхары пасёлка Парычы Светлагорскага раёна Уладзімір КАЗЛОЎСКІ і Галіна БРУХАНАВА — вяртаюцца з грыбоў на пароме па рацэ Бярэзіне.

ЛІЧБА ДНЯ

Амаль 9,6 тысячы

крэдытных дагавораў заключана з пачатку года па Указе № 240 аб адрасным субсідаванні будаўніцтва жылля. Па стане на 4 кастрычніка, банкі заключылі 9 574 крэдытныя дагаворы на суму Br493,2 млн. Пры будаўніцтве ўжо асвоена каля Br380 млн, усяго ж сёлета плануецца асвоіць Br592 млн. Крэдытныя рэсурсы выдаюць адразу шэсць беларускіх банкаў. Цяпер з прыцягненнем адрасных субсідый вядзецца будаўніцтва 114 дамоў. Больш за ўсё іх у Магілёўскай вобласці (29). Усяго ж на гэты год запланавана ўвесці 209 такіх дамоў. Большая частка кватэр выдзяляецца шматдзетным сем'ям.

КОРАТКА

- **Сярод шматдзетных ардэнаносных маці Мінска з кожным годам усё больш жанчын, якія працуюць.**
- Кампанія Singapore Airlines аднаўляе самы працяглы ў свеце авіярэйс. Працягласць палёту Сінгапур — Нью-Ёрк на адлегласць звыш 15 тысяч кіламетраў складзе 18 гадзін 45 хвілін.
- **Карпаратыўны фільм «Гонка кантынентаў» кінапраекта «БелАЗ 70» заваяваў дзве ўзнагароды міжнароднага фестывалю The Cannes Corporate Media & TV Awards.**

- Беларускі дзюдаіст Арцём Коласаў стаў двойчы чэмпіёнам юнацкіх Алімпійскіх гульняў у Буэнас-Айрэсе, а беларуска Анастасія Шкурдай там жа заваявала «серабро» ў плаванні на 50 метраў батэрфляем.

Фінансавы выдатнік

У ГЭТАЙ «ПАВУЦІНЕ» КАМЕРЦЫЯ НЕ ЗАГІНЕ

Эксперты ўпэўнены, што ў сегменце электроннай камерцыі ў нас яшчэ няма ўстойлівых брэндаў, хоць сітуацыя і пачала мяняцца ў лепшы бок

Па даных Гандлёвага рэестра Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, у нашай краіне 18 056 інтэрнэт-крам. У гэтым годзе МАРГ увёў спрошчаную сістэму падаткаабкладання для інтэрнэт-гандляроў. Што яшчэ на рынку электроннай камерцыі адбылося сёлета, мы запыталіся ў эксперта рынку — дырэктара правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслава СЕНІНА.

— У інтэрнэт-гандлі пераважаюць безнаяўныя плацяжы або вялікая доля ўсё ж такі за «кэшам»?

— Калі ў звычайных крамах за апошні час удалося дамагчыся добрых вынікаў па пераходзе на безнаяўную аплату, то парадаксальна, але факт: у электроннай камерцыі каля 56 % пакупнікоў усё яшчэ аплачваюць заказы наяўнымі пры дастаўцы. Праўда, гэта на 8 % менш, чым годам раней, але ўсё ж... Сёння банкаўскай карткай пры аплаце карыстаюцца 12 % пакупнікоў і гэта на 36 % больш, чым у мінулым годзе. І правільна робяць: безнаяўны від аплаты надзейней абараняе правы спажыўца, таму што выразна прасочваецца шлях грошай ад спажыўца да суб'екта.

Як паказвае цяперашні вопыт, далёка не ўвесь гандаль бачыць прасоўванне бізнесу ў інтэрнэт-камерцыю. Гэтым у асноўным займаюцца буйныя сеткі. Між тым замежны вопыт сведчыць пра тое, што гэта выгадная і перспектыўная ніша для прадаўцоў. Па даных Гандлёвага рэестра, на 1 ліпеня гэтага года колькасць інтэрнэт-крам перавысіла 17 тысяч, іх прырост з пачатку года склаў 10 %.

СТАР. 2

На дарозе

ДЗЕНЬ КАРАЦЕЙШЫ — АВАРЫЙ БОЛЬШ

Апошнім часам узрасла колькасць ДТЗ на дарогах краіны. Узнікаюць пытанні наконт таго, з чым гэта звязана і якія прымаць меры для скарачэння колькасці аварыйных сітуацый.

Як расказала **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК,** за верасень адзначана 308 дарожных здарэнняў. У іх загінулі 52 чалавекі, 347 атрымалі траўмы. З удзелам пешаходаў за той жа перыяд было зафіксавана 70 аварый, прычым 37 аварый адбыліся па віне саміх пешаходаў. У гэтых ДТЗ загінулі сем чалавек і атрымалі раненне 32. Выпадкаў наезду на веласіпедыстаў адзначана 38, адзін — на конны транспарт.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X